Впрочем, знания иностранных языков — требование почти повсеместное. Частные магазины сегодня ведут закупки товаров по всей Европе. Охотнее всего принимают на работу молодежь. Но именно молодежи становится все труднее соответствовать предъявляемым требованиям.

...У Войцеха и Дануты Клутзель две девочки-школьницы, Аня и Каролина. Хотя зарабатывает семья вполне прилично, позволить себе отдать девочек в частную школу не может. Живут они в государственной однокомнатной квартире и строят себе новый дом. А это по нынешним временам в Польше самое дорогое удовольствие. Даже в таком маленьком городке, как Плешев, земельный участок стоит чрезвычайно дорого.

Выпускники же государственных школ, похоже, скоро будут значительно уступать в уровне подготовки тем, кто учился в частных школах.

В государственных школах по причине нехватки средств сокращается количество учебных часов и внеклассных занятий по языкам, математике, техническим предметам, музыке, пластике. Не уменьшится только количество религиозных уроков.

— Дело в том, что мы свои уроки даем бесплатно, — разъяснил ксендз Гжегош Мазуркевич, преподающий религию в Плешевском лицее.

Хотя Польша — страна преданных католиков, подобный перекос в образовании у многих вызвал недовольство.

Положение многодетных семей призвано улучшить правительственное решение об изменении размеров государственных пособий, которое начнет действовать с 1 ноября. До этого на каждого ребенка выплачивалось пособие в размере 8 процентов среднего заработка по стране.

Теперь же на одного ребенка будет выплачиваться 4 процента среднего заработка в предыдущем квартале, на двоих— 12, на троих — 24, на каждого следующего — 12. Пособие будет выплачиваться до 16 лет, а если ребенок продолжает учебу — до 20.

Пособие выплачивается только тем семьям, в которых хотя бы один из родителей проработал 15 дней.

— Раньше пособие начинали выплачивать сразу же, как только кто-нибудь из родителей устраивался на работу, — поясняет шеф отдела социальной защиты Министерства труда Марек Маньковски. — Было немало случаев, когда устраивались только на один день, чтобы получить пособие, и сразу же увольнялись.

Этим же решением супругу, который воспитывает хотя бы одного ребенка в возрасте до восьми лет, будет выплачиваться ежемесячно 8 процентов среднего заработка.

Стремление государства облегчить положение наименее социально защищенных слоев населения очевидно, но слишком много «черных дыр» в государственном бюджете.

Но, как бы там ни было, скорбящих по коммунизму в Польше нет.

Иван ГЕРАСЮК,
обозреватель «Народной газеты».

Гасцёўня «Народнай газеты»

Уладзімір ДАМАШЭВІЧ:

«Мой камень знішчыў адно канкрэтнае зло...»

Яго не засудзілі пры Брэжневе толькі таму, што на Беларусі тады наогул амаль не судзілі за беларушчыну — лічылася: тут настолькі ўсё дэнацыяналізаванае, што асобныя «дзівакі» нічога не зменяць...

Уладзімір Дамашэвіч — адзін з нямногіх беларускіх пісьменнікаў, хто пісаў у застойны час без аніякай надзеі надрукаваць свае творы. Ягоны раман «Камень з гары» праляжаў у стале дваццаць гадоў, а сёлета за яго аўтар удастоены прэміі Прэзідыума РК прафсаюзаў Беларусі.



— «Камень з гары» — у назве рамана чытаецца вобраз таго каменя, які вечны Сізіф усё спрабуе ўскаціць на гару, а, дасягнуўшы, нарэшце, коштам неймаверных высілкаў той запаветнай вяршыні, высвятляецца, што ўсе сілы патрацію дарма: камень зноў коціцца ўніз. Дзякуй Богу, Ваша літаратурная праца ўсё ж не стала марнай. Раман выйшаў, хоць і праз дваццаць гадоў пасля напісання. Многім, хто пісаў, як душа жадае, а не як указвалі начальнікі ад літаратуры, так і не давялося пабачыць свае творы. Скажыце, Уладзімір Максімавіч, пра што падумалася Вам у той момант, калі ўзялі ў рукі так доўгачаканую сваю кніжку?

— Надзеі на тое, што я ўбачу сваю кніжку ў друку, у мяне не было ніякай. Я ж сам рэдактар, добра ведаў, што можа прайсці, а што не. Напісаўшы, паклаў на прасушку і ўзяўся за ваенную тэму — «гераіка» Айчыннай вайны. Напісаў аповесць «Порахам пахла зямля». Але і яе мне скарацілі на адну трэць, выкінулі ўсе «нетыповыя» эпізоды.

— Ваш раман — аўтабіяграфічны твор?

— Усё, што перажыў мой герой, перажыў і яго аўтар. Яго перажыванні мне блізкія і нават балючыя, я яму спачуваю, але лічу, што ён павінен быў несці свой крыж, бо хто за яго гэта зробіць? Ён мог прыстасавацца, мог выслужвацца перад начальствам, але ён гэтага не зрабіў, бо не дазваляла натура, не дазваляла сумленне. І ён вымушаны быў цярпець нястачы, перажываць за тое, што не можа забяспечыць сям'ю. Як добры работнік перажывае за тое, што робіцца не так, як трэба, так ён хацеў нешта змяніць хоць у той канторы, у якой ён служыў. Ды сілы былі няроўныя, ён заўсёды заставаўся пераможаным, а гэта накладвала адбітак на яго псіхіку. Узрастала пачуццё помсты, яно канкрэтызавалася. І таму мой герой у канцы і ідзе на такі рашучы, але, можа, недарэчны ўчынак, як забойства.

— Канкрэтныя рэаліі таго часу пазнаюцца ў рамане адразу нават мной, чалавекам, які ведае тое жыццё не з уласнага вопыту. Пазнаюцца многія героі. У Базылевічы бачым Васіля Быкава, у Каралевічы — Караткевіча. Замалёўкі з натуры ўзмацняюць дакументальную аснову рамана, цытаты з даваенных газет, якімі аўтар характарызуе ўзровень тагачаснага літаратурнага працэсу, у якім самой літаратуры месца зусім не заставалася. Скажыце, калі ласка, рыхтуючы кніжку да друку праз дваццаць гадоў пасля напісання, ці было ў Вас жаданне нешта дапоўніць, перапісаць?

— Якраз такога жадання ў мяне не было. Чаму? Відаць, таму, што ўсё тое ўжо адбылося і не хацелася да яго вяртацца. Па-другое, яно ўсё ўжо неяк застыла, набыло закамянелыя формы, як той бетон, як раствор, які схапіўся і зацвярдзеў назаўсёды. Гэта пісалася тады, вачыма чалавека таго часу — і так хай застаецца, не трэба «асучасніваць» тое, што стала ўжо фактам мінулага.

Хоць, каб я на гэтую тэму пісаў цяпер, шмат што набыло б іншы паварот, іншае тлумачэнне, бо чалавек, як вядома, не стаіць на месцы, ён развіваецца, расце датуль, пакуль ён жыве. Мо, гэта быў бы ўжо зусім іншы твор, мала падобны да гэтага. Але, з другога боку, ён нешта мог бы страціць з таго, што я ў яго ўклаў тады, а менавіта — непасрэднасць успрыняцця тагачаснага жыцця.

— Мне цікавая таксама Ваша сённяшняя ацэнка тых старонак, дзе Вы пішаце пра беларускую эміграцыю. Мяне, як чытача, які не са слоў ведае творы літаратараў беларускага замежжа, слухае перадачы з Мюнхена на беларускай хвалі, вельмі ўразілі, прызнаюся шчыра, тыя эпітэты, якімі Вы надзялілі замежных суайчыннікаў. Што гэта? Спроба выратаваць раман у тагачасных умовах ці нешта іншае, пра што чытачу не хацелася б думаць?

— Адносіны да беларускай пасляваеннай эміграцыі змяніліся ў нас у лепшы бок зусім нядаўна. Калі нашых ваеннапалонных называлі здраднікамі, то што ўжо казаць пра эмігрантаў, якія ўцякалі разам з немцамі? Ім літасці не было.

Мы ўсе былі пад цяжкім прэсам нашай прапаганды і толькі пакрысе з-пад яе вызваляемся.

Што датычыць таго, як мой герой ставіцца да беларускай эміграцыі, то ён называе яе «так званаю». Чаму? Ён знарок ставіць сябе ў афіцыйную позу, каб можна было спрачацца з начальствам, бо інакш яно ўвогуле не будзе з табою гаварыць, калі ты пакажаш, што маеш нейкія свае погляды, далёкія ад яго ўласных. Спрачацца можна было толькі на адной платформе.

Дык вось, калі эміграцыі няма, то чаму мы павінны прыслухоўвацца да таго, што нехта нешта гаворыць па радыёгаласах? А калі мы думку гэтай эміграцыі ўлічваем, дык яна ёсць? Тады давайце прызнаваць наяўнасць гэтай сілы, давайце з ёю спрачацца і даказваць, што яна не мае рацыі ў сваіх ацэнках.

Але ў той час такой раскошы нам не маглі дазволіць. Трэба было кіравацца схемай і не разважаць. А эміграцыйная пахвала ператваралася ў зручную дубіну, якою білі кожнага, хто сказаў нешта хоць трохі крытычнае пра нашы парадкі, праўдзівей — беспарадкі. Урэшце, не будзем забываць, што мой герой у рамане — гэта яшчэ не аўтар. Герою дазволена больш, чым аўтару.

— Герой рамана—літаратар. Ужо адно гэта накладвае на яго асаблівыя абавязкі за свае ўчынкі, таму што ён вымушаны дзейнічаць згодна з уласным сумленнем менавіта і з прычыны сваёй прафесійнай прыналежнасці ва ўмовах, калі літаратура ўспрымалася не як від мастацкай дзейнасці, а як выхавальнік, прапагандыст і агітатар. І вось гэты чалавек з абвостраным пачуццём справядлівасці ўзгадвае словы вясковай жанчыны пра тое, што калі нягоднік не перастае быць нягоднікам, то такога трэба проста забіць. І Драгун выра шыў, што гэтыя словы яму як прамая падказка, як жыць далей, калі выйсця, здавалася б, ужо нябачна. Такая псіхалагічная падаплёка ягонага ўчынку выглядае вельмі дзіўна, калі не сказаць больш. З такіх вось падказак утвараецца разуменне справядлівасці натоўпам у ягонай стыхійнай спробе нешта змяніць забіўшы, зруйнаваўшы. Нараджаюцца Ямелькі, Сцянькі... Тыпы, прама скажам, страшэнна далёкія ад ідэалаў дабра і справядлівасці. Ці згодны Вы з гэтым?

— Пытанне адплаты за зробленае зло даволі заблытанае. Тут варта гаварыць не пра адплату, а пра кару за зробленае зло. Закон павінен караць злачынцу, і тым больш сурова, чым большае злачынства. Аднак часам бывае так, што закон не дзейнічае. Узнікае пытанне: чаму? Лічыць учынак той асобы, якая зрабіла зло, зусім законным? Значыць, беззаконны сам закон, калі ён абараняе зло, беззаконне. Што застаецца рабіць? Чакаць, пакуль закон прыйдзе ў дзеянне? А калі чакаць трэба немаведама колькі?

І ў людзей пачынае разрастацца бунт супраць такога закону. І вось сам бунт. Бунтароў адразу хапаюць, караюць хутка і бязлітасна. А на добры лад трэба было б караць тых, хто давёў да бунту. Мой герой дзейнічае як бунтаўнік супраць закону. Такога закону, які не прымае мер у адносінах да злачынцы. І ў вачах закона ён сам становіцца злачынцам, а былы злачынец — ахвярай. Вось які хітры закон! І некаторыя бунтавалі супраць такіх законаў, хоць іх чакала жорсткая кара. Мой герой Драгун — менавіта з такіх людзей.

— Марнасць ахвяры — Сізіфава праца. Пэўна ж, за час, пакуль раман чакаў свайго чытача, Ваш герой ужо адсядзеў адмераны яму савецкім правасуддзем тэрмін. І выйшаўшы на волю, трапіў якраз у перабудову. Што б ён сёння рабіў? Ці пакаціў бы ён свой камень зноў да сваёй вяршыні?

— Назву «Камень з гары» я не звязваў з міфічным Сізіфам. Добра гэта ці кепска — не ведаю. У мяне была такая думка, што кожны з нас у пэўнай меры — кансерватар, любіць спакой, цішыню, як той камень, на месцы ляжыць і абрастае мохам. Але вось нехта скране яго з месца — абставіны, ці людзі, ці чалавек надта актыўны — і гэты камень ужо коціцца ўніз. І ці ён наробіць зла, ці, наадварот, прынясе нейкую карысць, цяжка адгадаць. Мне здаецца, што мой гэты камень знішчыў на сваёй дарозе адно канкрэтнае зло, зламаў перашкоду да справядлівасці. Чытач можа з гэтым не згадзіцца, на тое яго воля.

А разважаць, што сталася б з маім героем пасля ўсяго, я не асмельваюся. Вельмі тут усё ілюзорнае, няўстойлівае. Мне здаецца, што мой герой не выжыў бы...

Гутарку вяла
Валянціна АКСАК.

Невероятно?

«И прицельным ударом в коленную чашечку...»

Чего только не бывает в нашей жизни. Получив известие о происшествии в Червеньском районе Минской области, мы в редакции долго не могли поверить в случившееся... Не беря на себя следственные или экспертные функции, излагаем те материалы, которые имеются в нашем распоряжении. Кто здесь прав, а кто виноват — судить не нам. Но вот какая мысль изначально не дает покоя: только ли как скверный анекдот должна восприниматься эта история?

Итак, письмо в редакцию «Народной газеты»:

31 января 1991 года я, Александр Приходько, майор милиции, заместитель начальника Червеньского районного отдела внутренних дел, находился при исполнении служебных обязанностей — в форме и в милицейской автомашине. Около 15 часов в поселке Мирном мною был задержан нетрезвый гражданин в момент его управления автомобилем. (Впоследствии выяснилось, что этим гражданином являлся прокурор следственного отделения прокуратуры Минского гарнизона подполковник юстиции А. М. Столович.) Так как Столович не имел при себе документов, был в гражданской одежде, а вдобавок выражался нецензурной бранью и угрожал расправой сопровождавшим меня милиционерам, я принял решение доставить его в РОВД.

В момент задержания Столович оказал активное физическое сопротивление и причинил мне травму левой ноги. В дежурной части Червеньского РОВД подполковник юстиции продолжил в присутствии многочисленных свидетелей нецензурную брань и угрозы.

После освидетельствования А. Столовича в центральной районной больнице (при этом присутствовала его сестра, а также подполковник милиции С. Черницкий) был составлен протокол об управлении транспортом в состоянии алкогольного опьянения. Я также взял письменное объяснение у сестры А. Столовича, в котором она подтвердила, что накануне за обедом тот употреблял спиртное. Сам А. Столович не отрицал, что управлял машиной в нетрезвом состоянии, и подписал протокол. При этом присутствовал дежурный по РОВД В. Батура.

В результате удара, который нанес мне А. Столович, я находился на излечении с 4 февраля по 24 мая — почти 4 месяца. Перенес операцию.

Естественным моим поступком было то, что я обратился с заявлением в прокуратуру Червеньского района. Ответа оттуда долгое время не было. Несмотря на регулярные просьбы ознакомить меня с материалами проверки, я получал отказ как в прокуратуре Червеня, так и в Минской областной. Прокурор Червеньского района Милько направлял к следователю Мисюкевичу, а тот в свою очередь — к Милько... И только 25 июня после самых категорических требований я ознакомился с материалами проверки. Оказывается, в отношении меня был «отказной» материал.

Поражает и возмущает поведение прокурорских работников, которые, требуя от других соблюдения закона, сами не считают нужным следовать ему. Долгие месяцы ведется проверка. Из 15 человек —свидетелей действий А. Столовича —опрошены только 4. Мог бы назвать множество других процессуально-должностных нарушений, но прежде всего хотел бы получить ответы на следующие вопросы:

1. Почему Столович А. М. не понес наказания за управление транспортом в состоянии алкогольного опьянения?

2. Почему Столович А. М. до настоящего времени не привлечен к ответственности за причинение мне травмы?

3. Почему по данному факту разбирательство ведет червеньская прокуратура, тогда как в соответствии с законом в случае, если в конфликте участвовали военнослужащие, материал окончательно разрешается военной прокуратурой?

4. Кто конкретно виновен в умышленной волоките?

Прокурор следственного управления прокуратуры Минской области В. Н. Кривощекий в связи с отказом возбудить уголовное дело в отношении А. М. Столовича ответил майору милиции так:

Столович категорически отрицает нанесение Вам каких-либо ударов. По заключению судебно-медицинской экспертизы, имеющаяся у Вас травма в области коленного сустава могла образоваться как в результате ударно-травматического воздействия, так и в результате падения на ногу.

Кто поставит точку в этой истории?

На такіх зямля трымаецца

Іду знаёмай вуліцай

Валажынскаму, выдатніку будаўніцтва, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі СССР у галіне будаўніцтва, ёсць чым ганарыцца. Але чамусьці самым дарагім аб'ектам застаецца будынак гасцініцы. Адсюль бярэ пачатак яго слава. Тут упершыню прагучала яго асабістае я.

Больш чым за трыццаць гадоў прафесійнай дзейнасці шмат аб'ектаў пабудаваў Леанід Францавіч. Калі іх выстраіць у адну шарэнгу, ладная вуліца атрымалася б. Лічыце самі. Брыгада, якую ўзначальвае рабочы Савецкай Арміі Валажынскі, штогод здае 4—5 жылых дамоў. Тут не вуліца, цэлы мікраraён будзе.

Вось зараз, напрыклад, многа гавораць аб перабудове арміі, аб канверсіі.

— А якая яшчэ для нас можа быць канверсія, — пасміхаецца Леанід Францавіч, — хіба ж мы не на сацыяльныя патрэбы працуем? Вунь колькі афіцэраў і прапаршчыкаў з-за кардону вывелі. Хто ім кватэры пабудуе?

...Час сёння такі нестабільны. Разбягаюцца людзе хто куды, абы плацілі паболей. З ваенна-будаўнічых арганізацый бягуць больш чым адкуль. За знешнім строгім падпарадкаваннем самога парадку тут кот наплакаў. Чаму? — запытаецеся вы.

Ды таму, што ў любы, нават застойны, час умеў і ўмее Леанід Францавіч знайсці, як сам гаворыць, эканамічнае выйсце.

А надарылася бяда ў Арменіі, калі землятрус той страшэнны быў, і там брыгада сябе паказала. Першы дом у Ленінакане пабудавалі Валажынскага хлопцы. Пасарамацілі самых вядомых у краіне будаўнікоў.

Абодва сыны Леаніда Францавіча сталі прафесійнымі ваеннымі будаўнікамі. І Сяргей, і Аляксандр сталі афіцэрамі, асноўная спецыяльнасць якіх — інжынер. Бацьку, як нікога, радуе гэты выбар...

Ёсць у горадзе Мінску вуліца Чарвякова. Прыгожыя, вышынныя будыніны-гмахі стаяць там. Цэлы квартал, калі не больш. І ў кожным гэтым доме ёсць цагліны, пакладзеныя рукамі Леаніда Францавіча Валажынскага. Гэта адна з яго вуліц.

Віктар ХАРОШКА.

Напярэдадні падзеі

Запрашаем на «Гарэцкія чытанні»

З 46 гадоў жыцця Максіма Гарэцкага 8 гадоў звязана з Горкамі. Тут ён рыхтаваўся з рэпетытарамі да паступлення ў Горацкае зямельна-агранамічнае вучылішча, у якім вучыўся з 1909 па 1913 год, у Горках пачалася яго літаратурная дзейнасць, тут ён працаваў загадчыкам кафедры беларускай мовы і літаратуры ў акадэміі ў 1926—1928 гадах.

Раённы аддзел Горацкага райвыканкама, Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей, суполка «Роднае слова» 18—19 лютага 1992 года праводзяць «Гарэцкія чытанні», якія прысвечаны вывучэнню жыцця і творчасці беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага. Чытанні плануецца праводзіць штогод.

У праграме: пленарнае і секцыйныя паседжанні, канцэрт мастацкай самадзейнасці з выкананнем твораў М. Гарэцкага, экскурсія у в. Малая Багацькаўка, выданне зборніка тэзісаў дакладаў.

Просім тых, хто пажадае прыняць удзел у чытаннях, прыслаць да 1 снежня 1991 года заяўку і тэзісы даклада аб'ёмам да пяці старонак машынапісу на адрас: 213410, Рэспубліка Беларусь, Магілёўская вобласць, п. Горкі, зав. Якубоўскага, 2. Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей.

У. ЛІУШЫЦ,
дырэктар музея.

Чалавек не можа жыць без веры

Крыж на святым месцы

Святое месца насупраць гасцініцы «Шчара» горада Слоніма, якое каля трыццаці гадоў пуставала, з нядаўніх пор зноў прыцягвае да сябе людзей. Некалькі дзесяткаў чалавек сабраліся, каб на месцы былога праваслаўнага Праабражэнскага сабора ўстанавіць святы крыж.

Рашэнне аб яго ўстаноўцы было прынята на прыходскім сходзе слонімскай Свята-Троіцкай царквы.

Крыж быў устаноўлены без тэхнікі, уручную, як рабілі нашы продкі некалькі стагоддзяў назад. Уручную быў узведзены і праваслаўны сабор каля 1845 года. На жаль, гэты каштоўны архітэктурны помнік не захаваўся. Ён быў па-варварску знішчаны ў пачатку 60-х гадоў нашага стагоддзя. Сцены сабора былі моцныя, але і яны не вытрымалі. Спачатку іх узрывалі, а пасля расцягвалі танкамі. Цэглу разбіралі калгасы. Так з твару горада быў знішчаны прыгажун сабор, які лічыўся галоўным праваслаўным храмам Слоніма.

Дзе храм стаяў, сёння ўзвышаецца сяміметровы крыж.

Сяргей ЧЫГРЫН.
г. Слонім.

Пытанне—адказ

Кааператары за мяжой беднасці?

Растучае беспрацоўе няўмольна перш за ўсё ў адносінах да пенсіянераў і інвалідаў. Дзяржаўныя прадпрыемствы ад іх часам імкнуцца пазбавіцца. Адкажыце, ці шмат у рэспубліцы кааператываў, асноўную частку членаў якіх складаюць пенсіянеры?

Мікалай КРАЎЦОЎ, г. Мінск.

Па звестках, атрыманых у рэспубліканскім аб'яднанні кааператываў «Ветэран», у верасні гэтага года ў Беларусі існавала 59 кааператываў ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл. Прыкладна 85 працэнтаў членаў — каля 800 чалавек — і ёсць пенсіянеры, інваліды. Але іх сярэдняя зарплата, як правіла, не дасягае пражытачнага мінімуму.

Московские новости

Мы живем глупо

Один из виднейших московских ученых доктор экономических наук Отто Рудольфович Лацис дал четкую и лаконичную характеристику советской системе хозяйствования:

«Нет больше в мире стран, которые бы так глупо устроились. Мы не бедно живем, мы живем глупо».

Леонид ФАДЕЕВ.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Дайджест мыслей

Непонятливым урок повторится...

Сейчас мы прощаемся с коммунизмом. Раны, нанесенные им нашим душам и нашему обществу, еще долго будут болеть в нас. Но все же несомненно: в августе окончательно перевернута страница истории России, связанная с коммунизмом. Как надлежит нам прощаться с ним? Смеясь, как некто советовал расставаться со своим прошлым? Но там, откуда мы уходим, остались десятки миллионов, превращенных в «лагерную пыль». Проклиная? Но эта позиция по крайней мере не для Церкви, которая никого не может проклинать.

Человек, ходящий перед Богом, в таких случаях благодарит. Благодарит не только за то, что былое уходит, но и за то, что былое было. По мере взросления верующий человек научается узнавать смысл в происшедшем с ним. Нам дается испытание, чтобы, преодолев его, мы стали духовно глубже. И коммунизм, и причиненные им страдания не бессмысленны, не случайны, не абсурдны...

Тяжелая болезнь постигла Россию в обличье коммунизма. Может быть, она была попущена нам, чтобы избавить от какой-либо более страшной грозившей нам чумы. Может быть...

Впереди нас ждут еще более тяжкие испытания. Но хотя бы один урок должны мы вынести из коммунизма: насилием нельзя сделать мир и людей лучше. В нашем доме холодно. Но его нельзя протопить динамитом. Библейский мудрец напоминает: «Во дни благополучия пользуйся благом, а во дни несчастья размышляй». Нынешние дни вряд ли можно назвать «днями благополучия». Значит, для нас настали дни размышлений.

Алексий II,
патриарх Московский и всея Руси.

Неверагоднасці свету

Мазь для росту зубоў

Гэта сенсацыя абляцела свет, узбуджаючы непакой стаматолагаў на ўсіх кантынентах.
Хто б мог падумаць!
Знойдзена мазь для росту зубоў.

Напэўна, аўстралійскі знахар Марвін Александэр увойдзе ў гісторыю медыцыны як вынаходнік прэпарата, які вяртае людзям зубы. Загадку яго мазі даследуюць вучоныя з Сіднея.

Сям'я фермераў з ваколіц Сван Хіл Барбара і Дрэйк Уілкінсаны страцілі зубы даволі даўно і звярнуліся да знахара зусім па іншай справе. Абодва пакутавалі на хваробу страўніка і інфекцыю поласці рота. Звычайныя лекі, выпісаныя ўрачамі, не дапамагалі.

Марвін Александэр папрасіў іх прынесці для аналізу мясцовую ваду, гародніну і садавіну. Правёўшы аналіз, ён параіў сямейству Уілкінсан выкрасліць са свайго меню якія-кольвечы стравы, змяніць крыніцу вады і выкарыстоўваць састаў яго ўласнага прыгатавання. Для лячэння інфекцыі поласці рота ён прапанаваў мазь, якую неабходна было ўціраць у паднябенне і дзёсны.

— Сталі мы з жонкай лячыцца, — расказваў журналістам Уілкінсан. — Іншая вада, дыета, адвары траў далі эфект вельмі хутка, болі страўніка ў нас зніклі. Пад уздзеяннем мазі Александэра пачала праходзіць інфекцыя ў роце.

— Знахар параіў нам наведаць дантыста і заказаць зубныя пратэзы, —дадае Барбара. —Адсутнасць зубоў, на яго думку, тлумачылася толькі хваробай органаў стрававання.

У ваколіцах іх фермы стаматолага не было. Яны вырашылі з'ездзіць у Сідней, але толькі пасля заканчэння найважнейшых палявых работ.

— Я першая заўважыла, што ў маім роце адбываецца нешта дзіўнае, — гаворыць Барбара. — Дзёсны набрынялі, сталі свярбець. Тое ж самае выявілася і ў мужа.

Паехалі да стаматолага ў Сван Хіл. Той абследаваў іх, і вочы ў яго палезлі на лоб: ва Уілкінсанаў расслі зубы!

Яны вырашылі, што гэта падман. Але праз два тыдні, калі выразна праявіўся поўны камплект новых зубоў, зноў паехалі да знахара.

— Я пацвярджаю, што ва Уілкінсанаў выраслі новыя зубы, — гаворыць Александэр. — Тую мазь супраць інфекцыі я ўзяў у іх і выпрабаваў на двух бяззубых сабаках.

Журналісты пацвердзілі, што ў старых сабак пачалі расці зубы. Рэпарцёры прысягаюць, што іх сведчанне праўдзівае.

Знахар перакананы, што дапусціў нейкую памылку, калі падбіраў састаў мазі. Толькі якую? Над аналізам яе працуюць цяпер біёлагі і хімікі. Яны мяркуюць, што размова ідзе пра рэдкую аўстралійскую траву, якая ў выпадковым спалучэнні хімічных элементаў дала такі неверагодны эфект.

Іншага пункту гледжання прытрымліваецца прафесар Лары Х. Манамуд, даследчык паранармальных з'яў. Ён лічыць, што раён Сван Хіл стаў аб'ектам эксперыментаў НЛА, якія неаднойчы бачылі тут у апошнія тыдні.

(Па матэрыялах замежнага друку).

Прашу слова!

Аб каўбасе і мове

Зараз на Беларусі вельмі часта даводзіцца чуць папрокі ў адрас БНФ, іншых арганізацый і асоб у тым, што ў рэспубліцы гвалтоўна прымушаюць вывучаць беларускую мову. У асноўным матывіроўка зводзіцца да наступнага: народу есці няма чаго, у магазінах няма тавараў, каўбасы, а ад таго, што будзем размаўляць на беларускай мове, лепш жыць не станем.

Дык для чаго ж яна патрэбна нам, гэтая нацыянальная мова, і ці патрэбна ўвогуле?

Каб лягчэй уявіць адказ, паставім яшчэ адно пытанне. А што было б, напрыклад, з рускім (расейскім) народам, калі б ён па нейкіх прычынах (напрыклад, за фантастычна хуткае напаўненне Расіі амерыканскімі таварамі) замяніў рускую мову на англійскую?

Уявім сабе, што праз нейкі час у Расіі Пушкіна, Талстога, Дастаеўскага перакладалі б і чыталі на англійскай. Тэлебачанне, газеты, усё жыццё — на англійскай. Узнікае пытанне: страціў бы што-небудзь тады рускі народ або не? Вядома, страціў бы. Гэта разумее кожны. Таму, што былі б парушаны законы прыроды. Была б парушана пераемнасць пакаленняў, пераемнасць культуры гэтага народа.

Мы ў большай ступені, чым літоўцы, украінцы, рускія, забыліся сваю гісторыю, сваю культуру. Мы, як карабель у моры, які не мае дакладнага ўяўлення аб накіраванні руху да порта свайго прызначэння. І нам значна даўжэй і з большымі затратамі давядзецца да яго плыць. І не выпадкова, а заканамерна, што прадстаўнікі беларускай апазіцыі ў парламенце, якія вельмі высока паважаюць нацыянальную культуру, нацыянальную мову, ведаюць уласную гісторыю, упэўнены ў выбары шляху. І ў галоўным, як паказвае час, іх прагнозы і дзеянні правільныя.

Веданне нацыянальных і агульначалавечых культурных каштоўнасцей патрэбна чалавеку для таго, для чаго капітану карабля патрэбна веданне месцазнаходжання маякоў, падводных рыфаў, водмеляў і берагоў.

Нацыянальная мова пэўным чынам звязана і з мясцовасцю, і са светаўспрыняццем людзей, і з гісторыяй. І трэба памятаць, з якой сілай і настойлівасцю Польшча і Расія па чарзе спрабавалі выкарчаваць нашу мову. Але якой жа жывучасцю яна валодае, калі пры самай нязначнай магчымасці зноў і зноў пачынала адраджацца! Так было і ў 20-я гады, у час другой сусветнай вайны, веру —так будзе і зараз. Таму, што ў адваротным выпадку беларускі народ будзе пазбаўлены сваёй будучыні, знікне з твару зямлі і стане толькі малодшым братам у сям'і іншага народа.

Цяпер нам не вядомае пачуццё пляча суседа, пачуццё ўсенароднай еднасці, усё тое, што робіць людзей згуртаванымі і дапамагае пераадолець усе прыродныя, эканамічныя і палітычныя катаклізмы. Гэтае яднанне адбываецца многімі гадамі, стагоддзямі на нацыянальнай аснове. Калі народ згуртаваны, яго не возьмеш ні аўтаматамі, ні танкамі. І пацверджанне таму — падзеі ў Прыбалтыцы і зусім нядаўнія — у Маскве.

Прадстаіць доўгая, карпатлівая праца ўсіх нас, пакуль мова ажыве і зноў стане напеўнай і глыбокай, як нашыя беларускія песні. І калі-небудзь гэтыя песні будзем спяваць усе разам на вуліцах і плошчах, адчуваючы плячо адзін аднаго, як зараз гэта робяць у Прыбалтыцы, іншых цывілізаваных краінах.

І тады абавязкова ў магазінах будзе і каўбаса, і шмат што іншае, бо інакш і быць не можа. Таму што разам, узгоднена, аб'яднаўшыся агульнай культурай, гісторыяй, мовай, агульнымі радасцямі і засмучэннямі, можна вырашыць любыя праблемы.

Ігар ПЕТУХОЎ.



12—13 НОЯБРЯ
Начало в 19.00

ТЕАТР ОПЕРЫ И БАЛЕТА
сегодня — **«Война и мир»** (18.00), завтра — **«Дон Кихот»».**

ТЕАТР ИМ. Я. КУПАЛЫ
завтра — **«Голубая роза»,** на малой сцене в 19.30 — **«Гарольд и Мод».**

ТЕАТР ИМ. М. ГОРЬКОГО
сегодня — **«В будущем году, в это же время»,** в малом зале в 19.30 — **«Метеор»,** завтра — **«Невеста из Имеретии».**

ТЕАТР КУКОЛ
сегодня и завтра — **«Граф Глинский-Пепелинский** (10.30, 12.30).

БЕЛГОСФИЛАРМОНИЯ
сегодня в концертном зале, завтра в ДК железнодорожников — К ЮБИЛЕЮ НИЗАМИ ГЯНДЖЕВИ. **Фолк-джаз группа «АЙПАРО», ансамбль песни и танца им. Ф. Амирова,** художественный руководитель **Рамис Мирашли, фортепианное трио «Азери», мугамное трио; встреча с министром культуры Азербайджана Поладом Бюль-Бюль Оглы.**

(зал камерной музыки)
завтра — КОНЦЕРТ ФОРТЕПИАННОЙ МУЗЫКИ. **Сергей Мусаэлян.** Бах, Гайдн, Прокофьев, Шопен.

Программа телепередач

Вторник, 12 ноября

Программа БТ

16.30. ТВ — школе. Белорусская литература. 11-й класс.
17.05. Мультфильмы.
18.00. Док. фильмы.
18.55. Реклама.
19.00. Панорама.
19.25. Наш комментарий.
19.30. Факты и суждения. «Чернобыльский дневник».
20.30. Киноочерк.
20.40. Реклама.
20.45. Колыбельная.
21.00. «Дороги кобзарские». Фильм-концерт.
21.25. Телебиржа.
21.40. На сессии Верховного Совета Республики Беларусь.

Первая программа

15.15. В гостях у Н. Озерова.
15.45. «Картина». Трехсерийный худ. фильм. 2-я серия.
17.05. Мультфильм.
17.15. Вместе с чемпионами.
17.30. Детский музыкальный клуб.
18.15. Мир увлеченных.
18.30. ТСН.
18.45. Минуты поэзии.
18.55. «Ринг-бенди». Чемпионат Европы. Женщины.
19.10. Премьера док. фильма «Причастие» о последствиях чернобыльской аварии.
20.00. «Кузина из Бретани». Худ. фильм из серии «Полицейский участок» (Франция).
21.00. Информационная программа.
21.40. Театральные встречи.
23.15. ТСН.
23.30. «Простодушный человек с серыми глазами». Воспоминания о С. Прокофьеве.
0.50. Музыкальный прогноз.
1.20. Беседы с епископом В. Родзянко. Передача 19-я.

Российский канал

17.30. «ТелеЭКО».
18.00. Клуб путешественников.
19.00. Парламентский вестник России.
19.15. «Дальний Восток».
20.00. Вести.
20.20. Спокойной ночи, малыши!
20.35. СКВ.
20.45. «Монастырская жизнь в СССР». Док. фильм.
21.35. «Аплодисменты». На концерте В. Леонтьева.
22.00. Без ретуши.
23.00. Вести.
23.20. «Октябрь». Год независимости.

Среда, 13 ноября

Программа БТ

8.30. Утро республики.
8.45. Киноочерк.
9.00. ТВ — школе. Белорусская литература. 11-й класс.
9.35. Лира.
11.45. «Голоса одного дерева» Музыкальный фильм.
12.00. Док. фильм.
12.10. «Свята Русь-земля». Вологодские встречи.
13.00. «Стратегия риска». Трехсерийный худ. фильм. 1-я серия.
14.05. Премьера трехсерийного док. фильма «Миссия «Золотой век». Фильм 1-й.
14.40. Концерт.
16.30. Для детей. «Ты — цыпленок, я — цыпленок». Спектакль.
17.25. Мультфильмы.
18.00. Док. фильм.
18.10. Экономика и экология. Вилейский район.
19.00. Панорама.
19.25. Наш комментарий.
19.30. Родное слово.
20.15. Хозяин. «Будем ли мы зимой с теплом?»
20.45. Колыбельная.
21.00. Концерт.
21.35. Бизнес-клуб «Партнер» предлагает...
21.40. На сессии Верховного Совета Республики Беларусь.

Первая программа

6.30. Утро.
9.05. Вместе с чемпионами.
9.20. Детский музыкальный клуб.
10.05. Премьера худ. фильма «Из жития Остапа Вишни».
11.25. Мультфильмы.
12.00. ТСН.
12.10. Концерт артистов балета.
12.35. Премьера док. фильма «Родина. Мы вернулись».
14.15. Биржевой пилот.
14.25. Блокнот.
14.30. Телебиржа.
15.00. ТСН.
15.10. «Сегодня и тогда...»
15.40. «Картина». 3-я серия.
17.00. Детский час.
18.00. Тбилиси. Октябрь-91.
18.30. ТСН.
18.45. Планета.
19.20. Мультфильм.
19.40. Премьера худ. фильма «Из жизни Остапа Вишни».
21.00. Информационная программа.
21.40. Футбол. Отборочный матч чемпионата Европы. Сборная Кипра — сборная СССР.
23.20. ТСН.
23.35. Старинные романсы.
0.35. Беседы с епископом В. Родзянко. Передача 20-я.
1.00. Премьера док. фильма «Иоганн Себастьян Бах. Этапы его жизни». Фильм 1-й (Германия).
2.00. Биатлон. Главные старты впереди.

Российский канал

8.00. Гимнастика.
8.15, 8.45. Немецкий язык.
17.00. Концерт трио «Возар» (США).
17.30. Док. фильмы.
18.10. Ключ к мировому рынку.
18.40. Криминальные вести.
19.00. Баскетбол. Чемпионат Европы. СССР — Англия. Мужчины. В перерыве **(19.40)** — Вести.
20.40. Спокойной ночи, малыши!
20.55. «Уроки мастера». С. Прокофьев.
21.45. Литературная учеба, год 1992-й.
22.15. Мультфильм.
22.25. На сессии Верховного Совета РСФСР.
23.00. Вести.
23.20. Программа Ф. Донахью. «Бывшие боксеры-профессионалы».

Спорт-экспресс

БАСКЕТБОЛ

Чемпионат Европы для мужских клубных команд. Группа «А». «Калев» (Таллинн) — «Болонья» (Италия) — 80:87.

Баскетболистки подмосковного «Спартака» выиграли в Софии ответный матч розыгрыша Кубка Ронкетти у местной «Славии» — 67:57. Результат первой встречи — 79:74 в пользу советских спортсменок.

Киевский «Будивельник» играл во французском городе Шоле и потерпел поражение от местной команды со счетом 65:78. Дома украинские баскетболисты также проиграли — 76:92 — и выбыли из розыгрыша Кубка Корача.

ФУТБОЛ

Сообщаем результаты жеребьевки европейских футбольных кубковых турниров.

КУБОК ЧЕМПИОНОВ. Группа «А» — «Црвена звезда» (Югославия), «Андерлехт» (Бельгия), «Панатинаикос» (Греция), «Сампдория» (Италия); группа «В» — «Спарта» (Чехо-Словакия), «Динамо» (Киев), «Бенфика» (Португалия), «Барселона» (Испания).

КУБОК УЕФА. 1/8 финала. «Гент» (Бельгия) — «Динамо» (Москва).

Первые матчи групповых турниров Кубка чемпионов пройдут 27 ноября. В этот же день состоятся игры 1/8 финала розыгрыша Кубка УЕФА (ответные встречи — 11 декабря). Четвертьфинальные встречи за Кубок кубков пройдут 4 и 18 марта 1992 года.

Киевское «Динамо» свой первый матч проведет 27 ноября дома против «Бенфики». Расписание остальных встреч с участием киевлян: 11 декабря — «Спартак» — «Динамо», 4 марта — «Динамо» — «Барселона», 18 марта — «Барселона» — «Динамо», 1 апреля — «Бенфика» — «Динамо», 15 апреля — «Динамо» — «Спартак».

* Победа киевлян в Копенгагене над датским клубом «Брондбю» (1:0) открыла им доступ к деньгам Европейского союза футбольных ассоциаций (УЕФА). На головы динамовцев прольется «золотой дождь» швейцарских франков, которые УЕФА получит за продажу прав на трансляцию матчей групповых турниров Кубка чемпионов и 54 процента поступлений разделит между командами.

***

Хуан Антонио Самаранч, президент Международного олимпийского комитета, заявил, что три прибалтийские республики, провозгласившие независимость, могут быть допущены к участию в Играх в Барселоне 1992 года.

ШАШКИ

1-Й ШАШЕЧНЫЙ КОНКУРС
Публикуем очередные задания

Задание № 13

Белые: пр. a1, a5, a7, b4, c1, d2, f4, g1, g3, g5 (10).
Черные: пр. a3, b8, c5, d6, d8, e3, f8, g7, h2, h8 (10).
Выигрыш.

За правильное решение задания № 13 засчитывается **4 очка.**

Задание № 14

Белые: Д. a5, d2, f2, пр. c1, c3, e1 (6).
Черные: пр. b4, e5, f6 (3).
Белые начинают и запирают 2 шашки черных.

За правильное решение задания № 14 засчитывается **4 очка.**

Свои ответы на конкурсные задания присылайте по адресу: **220010, Минск, Дом правительства, комн. 369, редакция «Народной газеты», «На 1-й шашечный конкурс».**

ТУРНИР ВЕТЕРАНОВ

В первенстве республиканского Дворца шахмат и шашек по русским шашкам выступило 16 спортсменов. Победителем стал мастер спорта рабочий тракторного завода В. Полянский, набравший 12,5 очка из 15. На пол-очка от победителя отстал мастер спорта В. Дашкевич. Третьим призером стал мастер спорта Ю. Файнберг — 11,5 очка.

СОРЕВНОВАЛИСЬ КОМАНДЫ

Командный чемпионат СССР среди глухих по русским шашкам состоялся в Ивано-Франковске. В соревнованиях выступили сборные команды 9 республик, а также Москвы и Санкт-Петербурга. Наиболее успешно в турнире выступили украинские шашисты. Набрав 23,5 очка из 30 возможных, команда Украины стала чемпионом. Второе место заняла команда РСФСР — 20 очков. Бронзовые медали достались спортсменам Беларуси, набравшим 19 очков. В команде нашей республики успешно выступили минские кандидаты в мастера В. Якусевич и И. Навышний, занявшие вторые места на 2 и 3 досках.

РЕШЕНИЕ КОНКУРСНЫХ ЗАДАНИЙ

Задание № 3: концовка Я. Инсберга (Рига) решается путем 1. gh2 eg1 2. ef2 ge3 3. ab6 ac5 4. bc3 db2 5. gf4 eg3 6. hf4×.

Задание № 4: в этюде Б. Цойра (Вильнюс) к цели ведет 1. ba7 de3 (1 ...cd2 2. cf4 ac3 3. fe5×, 1 ...cb4 2. ag1 cd2 3. ce3 af2 4. ga3×) 2. ag1 cd2 3. ce3 af2 4. ga7×.


Погода

Сегодня днем по республике ожидается облачная с прояснениями погода. На большей части территории осадки, в основном дождь. Температура воздуха в Витебске, Могилеве — 2—4, Минске, Гомеле — 3—5, Гродно — 4—6, Бресте — 6—8 градусов тепла.

В последующие двое суток в северо-западных районах — осадки, в основном дождь. Температура воздуха 13 ноября ночью минус 3 плюс 2, днем 3—8 градусов тепла. 14-го ночью ноль минус 5, днем 5—10 градусов тепла.

«ПЛОХОЙ» ДЕНЬ

Напоминаем: 14 ноября — день, опасный для людей, переутомленных и ослабленных болезнями. Тщательно следуйте советам врачей.



Вам збіраюцца паказаць...

«ЦЕЛА»

Так называецца новая каляровая мастацкая кінастужка, створаная рэжысёрам Мікітам Хубавым на Маскоўскай кінастудыі імя М. Горкага паводле сцэнарыя Сяргея Ліўнева.

Галоўныя ролі выконваюць Ала Клюка, Максім Белякоў, Андрэй Жыгалаў, Алена Саліхава, Яўген Серакоў, Браніслава Захарава.

«ЛЕТА, ЯКОЕ ЗАЦЯГНУЛАСЯ»

Карціна створана мангольскімі кінамайстрамі. Аўтары сцэнарыя — Жаргалсайхан і Балжыням, рэжысёр — Сэлэнгэсурэн.

Няшчасная маці прывозіць сваю цяжкахворую дачку Арыўну ў пасёлак на беразе возера. У дзяўчыны паралізаваны ногі, і маці жыве адзінай надзеяй, што тутэйшае гаючае паветра і крыніца з мінеральнай вадой дапамогуць вярнуць Арыўне страчанае здароўе...

Няпроста складваецца лёс і ў маладога рабочага Галаа, які вырашыў што б там ні было выкрыць злоўжыванні і махінацыі свайго начальства. Нешчаслівы Галаа і ў асабістым жыцці. Нягледзячы на ўласныя няўдачы, Галаа здольны адгукнуцца на чужую бяду: ён акружае Арыўну цеплынёй і клопатам.

У фільме здымаліся Сасарбарам, Аюўн, Сэлэнгэ, Жыгжыдулам, і іншыя.

«ГІСТОРЫЯ АДНОЙ СУСТРЭЧЫ»

Вытворчасць Нацыянальнага кіраўніцтва кінагандлю і кінапрамысловасці, Алжыр. Фільм зняты рэжысёрам Брахімам Тсакі паводле свайго сцэнарыя. Гэта гісторыя сустрэчы двух глуханямых, дзяўчыны і юнака, сустрэчы, якая адбылася на нафтавым радовішчы ў адной з краін трэцяга свету.

Фільм удастоены галоўнага прыза IX Панафрыканскага фестывалю ва Уагадугу (1985 г.), а таксама адзначаны ўзнагародай на Міжнародным кінафестывалі ў Венецыі.

У галоўных ролях заняты Бумедзьен Беласры, Карын Мацiс, Алан Жыль, Махамед Арбу.

«ВЕРА»

Гэта новая кінастужка створана рэжысёрам А. Коганам на Заходне-Сібірскай студыі кінахронікі.

Карціна ўяўляе сабой фільм-партрэт народнай артысткі РСФСР Веры Паўлаўны Рэдліх.

Народныя прыкметы

11 лістапада, на прысвятак Настусі, пачыналі стрыгчы авечак.

Дзень Марціна, які ў каталіцкім календары супадаў з гэтым днём, прызнаваўся ў народзе прысвяткам млынароў, відаць, таму, што пасля яго ледзяная скарынка скоўвала рэчкі, і тады на млынах спынялася работа. Ад надвор'я на Марціна (яго ў асобных вёсках лічылі таксама пачаткам зімы) залежалі, думалася, не толькі паасобныя наступныя дні, але і цэлыя сезоны. Напрыклад, калі Марцін з'яўляўся з дажджом ці разводдзем, то гэтым абяцаў на Каляды лёд і пазней — мокрае лета. Гаварылі, што на Марціна мядзведзь кладзецца ў бярлогу і пачынае смактаць лапу, на Стрэчанне — паварочваецца і смокча другую лапу, а на Благавешчанне — выходзіць з бярлогі.

12 лістапада да святога Арцёма смаленскія беларусы звярталіся: «Святэй Артошка, напрадзі пачатак з лукошка, а клубок з карабок, а мальчык, напрадзі пачатак з пальчык».

Уладзімір ВАСІЛЕВІЧ.

Кино

12 ноября

Справочная киносети — 20-90-90.

«МОСКВА»: программа документальных фильмов **«Цирк, да и только»** (предсеансовый зал). **«Похищенная»** (п)** — 9.40, 14.00 (л), 16.00, 18.00, 20.00, 22.00 (н). **«Мэкки-Нож»** (1,5 с.) — 11.30. Видеозал: **«Индиана Джонс и последний крестовый поход»** — 16.30, 18.45, 21.00.

«ОКТЯБРЬ»: **«Похищенная»** (п)** — 9.55, 11.50, 16.05, 18.00, 20.00, 21.55. **«Мэкки-Нож»** (1,5 с.) — 13.45 (л).

«АВРОРА»: **«Илья Муромец»*** — 9.50, 14.20. **«Мистер Пронька» и др. мультфильмы*** — 11.40, 13.00. **«Звездные войны»** (1,5 с.) — 10.10, 12.20, 14.30, 16.40, 18.50, 21.00. **«Виват, гардемарины!»** (2 с.), (п) — 11.00, 13.30, 16.00, 18.30, 21.10. **«Куда вы едете?»** — 18.20 (удл.). **«Ночь святого Лоренцо»** — 16.20 (л). **«Скорпион»** — 20.50.

«БЕРЕСТЬЕ»: **«Боцман и попугай» и др. мультфильмы*** — 10.30. **«Мария, Мирабела в Транзистории»** — 14.30. **«Рэмбо. Первая кровь»** — 10.00, 16.00, 18.30, 20.30. **«Иллюзия смерти»** (п) — 12.00, 14.00, 18.00, 20.00, 22.00 (н). **«Джунгли»** —12.30 (л), 16.30.

«ВИЛЬНЮС»: **«Похищенная»** (п)** — 10.00, 12.00, 16.30, 18.20, 20.10, 22.00 (н). **«Мэкки-Нож»** (1,5 с.) — 14.20 (л). Видеозал: **«Рыжая Соня»** — 15.25, 19.35, 21.40. **«Робот-полицейский»** — 13.20, 17.30.

«ДРУЖБА»: **«Виват, гардемарины!»** (2 с.), (п) — 10.00, 15.00, 19.30. **«Смертельный микроб»** — 13.00, 17.40, 22.00 (н). Видеозал: **«Клиника доктора Куреты»**** — 15.40, 19.00. **«Список смертников»** — 14.00, 17.10, 20.30.

«ПАРТИЗАН»: **«Виват, гардемарины!»** (2 с.), (п) — 12.00, 16.30, 19.00. **«Галаксина»** — 10.00, 14.30 (л), 21.30.

«ПОБЕДА»: **«Галаксина»** — 10.00, 14.30 (л), 16.20, 21.00. **«Виват, гардемарины!»** (2 с.), (п) — 11.50, 18.10. Видеозал: программа «Лирическая комедия». **«За бортом»** — 11.00, 16.10, 21.10. **«Коммандос»** (2 с.) — 13.20, 18.20. Видеосалон, видеокафе **«Отряд ниндзя»** — 11.10, 15.50, 20.40. **«Игра в смерть»** — 13.30, 18.10.

«САЛЮТ»: **«Волшебная ночь»*** — 10.00. **«Мэкки-Нож»** (1,5 с.) — 13.40 (л). **«Похищенная»** (п)** — 11.40, 16.00, 18.00, 20.00, 22.00 (н).

«СОВРЕМЕННИК»: **«Десять лет без права переписки»**** — 14.00, 19.10. **«Иллюзия смерти»** (п) — 16.00, 17.40, 21.00.

«КИЕВ»: **«Последняя двойка»*** — 14.20. **«Деловая женщина»** (1,5 с.), (п)** — 10.00, 20.00, 21.50. **«Океан»** (2 с.) — 11.50 (л), 17.30. **«Бабник»** — 16.10.

** — только для взрослых,
(л) — льготный,
(п) — премьерный показ.
* — для детей,

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, калі ў матэрыялах змешчаны даныя, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Лісты чытачоў друкуюцца на мове арыгіналаў.

Рэдакцыя «НАРОДНАЙ ГАЗЕТЫ» прымае заказы на змяшчэнне аб'яў, рэкламы. Даведкі часова па тэлефоне 29-66-59.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220010, Мінск, Дом урада, пакой 369, тэл. 29-65-50.

ИНДЕКС 63868.
Выходит ежедневно, кроме воскресенья и понедельника, 250 раз в году.
Тираж 300 тыс. экз.
Подписана в печать в 19.10.
Газета отпечатана в типографии издательства «Белорусский Дом печати».
Способ печати — офсетный, формат А-2.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Галоўны рэдактар
Іосіф СЯРЭДЗІЧ.